# Тэма: Склон назоўнікаў. Асновы назоўнікаў

**Мэты:** актуалізаваць звесткі пра віды сувязі, з дапамогай якіх словы звязваюцца ў сказах, і спосаб вызначэння склонаў назоўнікаў; даць паняцце пра прамы і ўскосныя склоны, пазнаёміць з паходжаннем тэрмінаў – назваў склонаў; фарміраваць уменні правільна вызначаць склон назоўніка, ужываць назоўнікі ў патрэбнай форме; узнавіць веды пра тыпы скланення назоўнікаў і характэрныя для іх канчаткі; дапамагчы вучням асэнсаваць сутнасць падзелу асноў назоўнікаў на 4 групы, залежнасць ужывання склонавых канчаткаў ад характару асновы назоўніка; фарміраваць лінгвістычнае мысленне, спрыяць выхаванню добрых адносін да Беларусі, да беларусаў

**Абсталяванне:** падручнік для 6 класа, бланкі для адказаў, карткі, малюнкі, табліцы, фразеалагічны слоўнік, прэзентацыя.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйна-матываваны момант**

Добры дзень! Сядайце. Усміхніцеся адзін аднаму, прывітайце ўсмешкай і нашых гасцей. Хай ад вашай усмешкі стане цяплей на душы, хай яна дапаможа лёгка і радасна працаваць на ўроку, стварыць добры настрой. Я вельмі хачу, каб наш урок атрымаўся цікавым, пазнавальным, каб мы разам паўтарылі і замацавалі тое, што ўжо ведаем, і адкрылі новыя таямніцы роднай мовы.

**II. Праверка д/з**

- Лінгвістычная размінка (**слайд 2**)
  - Гульня называецца <u>“Веру - не веру”.</u> Я называю вам сцверджанне. Калі яно правільнае і вы “верыце”, то неабходна замаляваць кружок, калі “не”, то пакідаць яго пустым.

(Кожны вучань атрымлівае бланкі для адказаў). Верыце вы, што…

1. Назоўнікі адказваюць на пытанні хто? што? (веру)
2. Назоўнікі радасць, смех з’яўляюцца абстрактнымі? (веру)
3. Зборныя назоўнікі не спалучаюцца са словамі 2,3? (веру)
4. Значэнне зборнасці выражаецца суфіксамі ств, цтв? (веру)
5. Назоўнікі капуста, аспірын рэчыўныя? (веру)
6. Назоўнікі крупы, дзверы ўжываюцца толькі ў множным ліку? (веру)
7. У перакладзе з рускай мовы диван гэта дыван? (не веру)
8. Дзяжурны доктар Васількова запісана правільна? (веру)
9. Назоўнікі мядзведзь, заяц асабовыя? (не веру)
10. Назоўнікі мука, сок ужываюцца толькі ў адз. ліку? (веру)
11. У назоўніка гусь у рускай і беларускай мовах род супадае? (не веру)
12. У Р. склоне пытанні каму? чаму?(не веру)

А зараз злучыце ўсе замаляваныя кружочкі лініямі. Што ў вас атрымалася?

- **Адказ.** (У кожнага павінна атрымацца лічба 9) (**слайд 3**)

**III. Паглыбленне ведаў па тэме.**

- Запіс даты, тэмы ўрока ў сшытак. (**слайд 4**)
- Вызначэнне задач урока. (**слайд 5**)
- Гутарка па пытаннях:
- Колькі **склонаў** у беларускай мове? Узгадайце парадак склонаў і пытанні да кожнага з іх ( вывешваецца табліца). (**слайд 6**)
  - А зараз Валерыя зробіць невялікае паведамленне. Яна дасць тлумачэнне назвам склонаў.
  - Назоўны склон – гэта прамы склон. Як называюцца ўсе астатнія? (ускосныя)
  - Давайце праскланяем слова **фразеалагізм** (вусна)
  - Што такое фразеалагізм? (устойлівыя спалучэнні слоў)

    **Фразеалагізм** - гэта ўстойлівая, узнаўляльная, не менш як двухкампанентная сінтаксічна непадзельная моўная адзінка з цэласным значэннем.
- **Практ. 191**
  - Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі.
  - Выпісаць словазлучэнні з назоўнікамі, вызначыць склон.
  - Каб вызначыць склон назоўніка ў сказе, давайце складзём **алгарытм** (**слайд 7**)

    1. Знайсці слова, да якога адносіцца назоўнік.
    2. Паставіць ад гэтага слова пытанне да назоўніка.
  - **Кажуць (пра каго?) пра чалавека (В.с.), складаецца (з чаго?) з абадка, рабілі (з чаго?) з кары, плялі (што?) сетку, плялі (з чаго?) з валакна, прасейвалі (праз што?) праз сетку, мяце (пад чым?) пад кустом.**

  - Давайце прачытаем зноў 1 сказ з гэтага тэксту. Як аформлены сказ?(сказ з простай мовай). Мы ўспаміналі на ўроку азначэнне фразеалагізма. Знайдзіце ў ім фразеалагізм (**галава як рэшата** – дрэнная памяць**).** Назавіце яшчэ фразеалагізмы, якія характарызуюць памяць чалавека. (**кароткая памяць, курыная памяць, дзіравая памяць, дзіравая галава, вылецела з галавы**…). Дзякуючы фразеалагізмам наша мова становіцца больш эмацыянальнай, вобразнай, яркай.
  - Найбольш папулярны гутарковыя фразеалагізмы. Умее выкарыстоўваць іх у сваёй мове толькі чалавек з багатай душой. Такімі людзьмі з'яўляліся нашы продкі. Якія рысы нацыянальнага характару можна вылучыць у іх? (мудрасць, таленавітасць)

    У наш час вобразная гаворка – прыкмета начытанасці чалавека. Пагэтаму вам, дзеці, трэба часцей карыстацца фразеалагічным слоўнікам.
- **Запіс сказа на дошцы**

**"Фразеалагізмы – гэта самародкі, самацветы роднай мовы, залацінкі народнай мудрасці", - гаварыў І.Я.Лепешаў.** Растлумачыць знакі прыпынку у сказе, вызначыць склон назоўнікаў)

**IV. Фізкультхвілінка (слайды 8-14)**

По малюнку вызначыць фразеалагізм:
**кракадзілавы слёзы** – пра няшчырае, прытворнае шкадаванне, спачуванне;
**стрэляны верабей** – дасведчаны чалавек, якога цяжка або немагчыма падмануць;
**белая варона** – аб тым, хто рэзка адрозніваецца ад іншых, не падобны;
**вадзіць за нос** – падманваць;
**як кура лапай** – неакуратна, неахайна;
**стаяць на галаве**- свавольнічаць;
**як кот наплакаў** –мала.

**V. Паглыбленне ведаў па тэме**

- Праца з падручнікам.

- Змяненне назоўнікаў па склонах называецца **скланеннем**. Карыстаючыся схемай практ 193, раскажыце пра тыпы скланенняў назоўнікаў. Прывядзіце свае прыклады. Давайце складзём **алгарытм**, каб правільна вызначыць скланенне назоўнікаў ( табліца). (**слайд 15**)
  1. Назоўнік паставіць у форме Н. склону адзіночнага ліку.
  2. Вызначыць род і канчатак назоўніка.

- Гульня **“Канструктар”** (работа ў пары). У канвертах знаходзяцца словы. Усе назоўнікі. За 1 хвіліну вам трэба раскласці іх на 3 групы па скланеннях:

  **1 скланенне**: унучка, мова, зямля (3 словы)
  **2 скланенне:** сын, пісьмо, снег, таварыш, лётчык, пень, возера (7 слоў)
  **3 скланенне:** ноч, радасць (2 словы)

- Аналіз слоў, запісаных на дошцы, вызначэнне асновы: **Радзіма, зямля, мяжа, бераг.** Запішыце, выдзеліце аснову, падкрэсліце літары, якія абазначаюць апошні зычны гук асновы. Вывад: **назоўнікі маюць 4 асновы**: аснова на цвёрды зычны, аснова на мяккі зычны, аснова на зацвярдзелы зычны, аснова на г, к, х. Прывядзіце свае прыклады. ( табліца практ. 195)

- Працягваем **гульню “Канструктар**”. Зараз вам трэба таксама за 1 хвіліну раскласці гэтыя ж назоўнікі ўжо ў 4 групы (па асновах назоўнікаў)

  **аснова на цвёрды зычны**: мова, пісьмо, сын
  **аснова на мяккі зычны**: пень, зямля, радасць
  **аснова на зацвярдзелы зычны:** таварыш, возера, ноч
  **аснова на г, к, х:** унучка, лётчык, снег

- Практ. 194 (чытанне верша)

- Хто з’яўляецца лірычным героем прачытанага верша?
- Якім паўстае перад намі гэты герой?
- Якая асноўная думка верша? (Беларусы – дружалюбныя людзі).
- Давайце з дапамогай назоўнікаў запішам нацыянальныя рысы характару беларусаў, вызначым скланенне, аснову.

  ✓ Запіс на дошцы

  **Дружалюбства, адкрытасць, вальналюбства, мудрасць, таленавітасць, працалюбства, гасціннасць**…

  **Дружалюбства** – зрабіць марфемны і словаўтваральны разборы

- Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне “наказ, дадзены кім-небудзь сваім патомкам” - запавет. Складзіце з гэтым словам сказ, у якім заключалася б асноўная думка верша.

  ✓ Запіс на дошцы (калі дазваляе час на ўроку)

  **Беларус адкрыты ўсяму свету, і ён хоча вольна жыць і служыць добрым запаветам.** (вызначыць склон, скланенне назоўнікаў)

**VI. Праверка засваення ведаў па тэме.**

**Самастойная работа.** (2 вучні працуюць каля дошкі)

- Выпісаць з другой страфы верша пр. 194 словазлучэнні з назоўнікамі, вызначыць іх склон, скланенне, аснову

  **Цаню дружбу(В.с.,1 скл.), дружыць з сусветам, адкрыты свету, служыць запаветам.**

**VII. Рэфлексія. (слайды 16-17)**

- Падводзім вынікі сваёй працы па тэме ўрока. Што для вас было цікавым? Што новага даведаліся на ўроку? Чаму навучыліся? Як адчувалі сябе на ўроку? Выберыце адпаведны фразеалагізм:
  - не пакладаючы рук
  - да сёмага поту
  - закасаўшы рукавы
  - у поце твару
  - абы з рук
  - біць лынды
  - гуляць у бірулькі
  - мартышчына праца

**VIII. Дамашняе заданне.** §31, практ. 196. (**слайд 18**)